# ПЕРАЛІК ДАКУМЕНТАЎ ДЛЯ ПАСТУПАЮЧЫХ
## на вочную (дзённую) форму атрымання агульнай вышэйшай адукацыі:

• заява на імя кіраўніка УВА па ўстаноўленай Міністэрствам адукацыі форме (афармляецца ў лічбавым кабінеце абітурыента і непасрэдна пры падачы дакументаў);

• арыгінал атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі, або арыгіналы дыплома аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі і дадатку да яго, або арыгіналы дыплома аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі і дадатку да яго, за выключэннем ніжэйзгаданых выпадкаў:

- арыгінал атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі і арыгіналы дыплома аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі на аснове агульнай сярэдняй адукацыі і дадатку да яго - для асоб, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную адукацыю на аснове агульнай сярэдняй адукацыі;
- арыгінал атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі і арыгіналы дыплома аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі на аснове агульнай сярэдняй адукацыі і дадатку да яго – для асоб, якія атрымалі сярэднюю спецыяльную адукацыю на аснове агульнай сярэдняй адукацыі;

• арыгіналы сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання (далей - ЦТ), праведзенага ў Рэспубліцы Беларусь у 2025 ці ў 2026 годзе;

• арыгіналы сертыфікатаў цэнтралізаванага іспыту (далей - ЦЭ), праведзенага ў Рэспубліцы Беларусь у 2025 ці ў 2026 годзе;

• медыцынская даведка аб стане здароўя па форме, якая ўстанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя;

• характарыстыка, выдадзеная ўстановай агульнай сярэдняй адукацыі або ўстановай, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі, па форме і ў парадку, якія ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі (для асоб, якія атрымалі агульную сярэднюю, прафесійна-тэхнічную адукацыю або сярэднюю спецыяльную адукацыю ў 2026 годзе) па ўстаноўленай форме;

• дакументы, якія пацвярджаюць права абітурыента на льготы пры залічэнні для атрымання агульнай вышэйшай адукацыі;

• фатаздымкі 3*4 - 6 шт.

**<u>Да вышэйпералічаных дакументаў, выкананых на замежнай мове, адначасова прыкладаецца засведчаны натарыяльна іх пераклад на беларускую ці рускую мову.</u>**

**Дадаткова ў прыёмную камісію пры неабходнасці прадстаўляюцца:**

• заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай або медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі аб адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў да навучання па атрыманай спецыяльнасці і прысвайваемай кваліфікацыі - для асоб з парушэннямі зроку, слыху, функцый апорна-рухальнага апарата ва ўзросце да 18 гадоў, інвалідаў I, II або III групы;

• заключэнне дзяржаўнага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі або даведка аб асваенні зместу адукацыйнай праграмы

спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі - для асоб з парушэннямі зроку, слыху, функцый апорна-рухальнага апарата;

• хадайніцтва адпаведнай федэрацыі (саюза, асацыяцыі) па віду (відах) спорту, уключанай у рэестр федэрацый (саюзаў, асацыяцый) па віду (відах) спорту, а пры адсутнасці такой федэрацыі (саюза, асацыяцыі) - хадайніцтва іншай рэспубліканскай федэрацыі (саюза, асацыяцыі) па віду (відам) спорту, а таксама арыгінал і копія класіфікацыйнай кніжкі, якая пацвярджае наяўнасць не ніжэй I спартыўнага разраду, або арыгінал і копія пасведчання аб спартыўным званні "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь міжнароднага класа" або "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь", або даведка, якая пацвярджае спартыўныя дасягненні, выдадзеная Міністэрствам спорту і турызму або галоўным упраўленнем (упраўленнем) спорту і турызму абласнога (Мінскага гарадскога) выканкама, - для асоб, указаных у пункце 33 гэтых Правіл;

• даведка аб пацвярджэнні знаходжання ў складзе нацыянальнай або зборнай каманды Рэспублікі Беларусь па віду (відах) спорту, выдадзеная Міністэрствам спорту і турызму;

• іншыя дакументы, прадугледжаныя п. 13 Правіл прыёму асоб для атрымання вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі *(Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 студзеня 2022 г. № 23).*

*Прыёмная камісія мае права дадаткова запытаць у абітурыента дакументы, неабходныя для прыняцця адпаведнага рашэння, а таксама фатаздымкі абітурыента для ажыццяўлення справаводства, колькасць, від і памер якіх устанаўліваюцца УВА ў парадку прыёму ва УВА.*

Дакументы ў прыёмную камісію падаюцца абітурыентамі асабіста або іх прадстаўнікамі.

У выпадку падачы дакументаў абітурыентам дакумент, які пацвярджае асобу, прад'яўляецца ім асабіста.

У выпадку падачы дакументаў ад імя абітурыента яго законным прадстаўніком прад'яўляюцца дакументы, якія пацвярджаюць асобу і статус законнага прадстаўніка, і копія дакумента, які пацвярджае асобу абітурыента.

У выпадку падачы дакументаў ад імя абітурыента яго прадстаўніком, які дзейнічае на падставе даверанасці, прад'яўляюцца дакумент, які сведчыць асобу прадстаўніка, копія дакумента, які сведчыць асобу абітурыента, і даверанасць, засведчаная натарыяльна або ўпаўнаважанай службовай асобай.
Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 03.06.2008 № 294 (у рэдакцыі ад 16.03.2021 № 107) "Аб дакументаванні насельніцтва Рэспублікі Беларусь" устаноўлена, што **дакументамі, якія сведчаць асобу, з'яўляюцца**:
• пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;
• від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь;
• пасведчанне бежанца;
• ідэнтыфікацыйная карта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

• біяметрычны від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь замежнага грамадзяніна;
• біяметрычны від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь асобы без грамадзянства.